# ТЭМА КАХАННЯ Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА ТАНКА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЕРШАЎ «Я АТРЫМАЎ ТВАЁ ПІСЬМО…», «АМАЛЬ НІКОЛІ Ў ЮНАЦТВЕ…»)

***Д. А. Бердніковіч***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле праводзіцца параўнальны аналіз узораў інтымнай лірыкі: супастаўляюцца вершы Максіма Танка «Я атрымаў тваё пісьмо…» і «Амаль ніколі ў юнацтве…». Разглядаюцца зместавыя і фармальныя асаблівасці, сістэма вобразаў. Паказваецца спецыфіка выкарыстання біблейскіх алюзій у кожным з мастацкіх тэкстаў.

**Ключавыя словы:** Максім Танк; тэма кахання; інтымная лірыка; вобразы Адама і Евы; біблейскія алюзіі.

Фрэнсіс Скот Фіджэральд падарыў свету наступную думку: «Я кахаю цябе, і гэта пачатак і канец усяго». Падаецца, гэты выраз вельмі трапна падыходзіць да твора Яўгена Іванавіча Скурко. У жыцці Максіму Танку вельмі пашанцавала, яго каханне з жонкаю, Любоўю Андрэеўнай, не ведала межаў і часавых рамак. Але ж каханне – вельмі зменлівая з’ява, кожны, хто ім быў сагрэты і ашчасліўлены, безумоўна пагодзіцца, як часам становіцца без яго стыла і горка. Пачуцці ў сапраўдным каханні адны на дваіх, яны ўзаемныя і ўзаемазалежныя, і гэта пачатак і канец усяго...

Верш «Я атрымаў тваё пісьмо…» (1988) дае магчымасць паглядзець на Максіма Танка як на майстра інтымнай лірыкі. Кожны радок напоўнены нечаканымі вобразамі, малюнкамі, асацыяцыямі. Падаецца, што ў вершы распавядаецца пра закаханых, якім не суджана быць разам і неабходна паставіць крыж на іх сумеснай будучыні. Але, улічваючы вышэй прыведзеныя факты (адрасатам верша ўяўляецца жонка, з якою Максім Танк пражыў усё жыццё душа ў душу), можна зрабіць выснову, што верш зусім не пра гэта. Тэма твора – моцнае каханне, у якім часова пануе разлад. Лірычны герой раскрывае свой унутраны свет, які наскрозь прасякнуты тугой, шкадаваннем па імгненнях мінулага, пакутамі ад немагчымасці вярнуцца да «страчанага раю».

Хто ж вінаваты ў тым, што лірычны герой быццам бы гарыць у пекле?

*Хто вінават – дарма судзіць;*
*Ці я, Адам, ці ты мо Ева.*
*Ці той, хто ў садзе пасадзіў*
*Знарок спакуслівае дрэва* [1, с. 126].

Параўноўваючы лірычнага героя верша і яго каханую з «першымі людзьмі», Максім Танк праз алюзію паказвае моц кахання: ва ўсім свеце існуюць толькі сучасныя Адам і Ева і нікога болей. Ці ж многія могуць пахваліцца тым, што дасягнулі раю на зямлі? Калі ўспрымаць верш як паэтычны ліст Максіма Танка да Любові Андрэееўны, то, напэўна, могуць. У гэтай пары не ўзнікае патрэбы ўтойваць што-небудзь, яны не саромеюцца сваіх пачуццяў, адкрыты адзін для аднаго як на фізічным, так і на духоўным узроўні; узроўні, калі ўжо няма сэнсу прыхоўваць «аголенасць» душы і сэрца. Цікава, што ў вершы, дзе паўстаюць вобразы Адама і Евы, адсутнічае вобраз Змея-спакусніка, і гэта можна інтэрпрэтаваць наступным чынам: ніякія знешнія абставіны не паўплывалі на тое, што здарылася. Дрэва заўсёды расло ў Эдэме, людзі самі знайшлі ў ім спакусу, бо, як вядома, забаронены плод заўсёды салодкі. Але хто ж такі таямнічы «Той», які пасадзіў «спакуслівае дрэва»? Паводле Бібліі, дрэва пасадзіў Бог. Гэта можа ўспрымацца як намёк: можа, такі фінал зносінаў быў «знарок» наканаваны і людзі ўсё ж праўдзіва кажуць, што ад свайго лёсу не збегчы.

У вершы сумяшчаюцца «рэальны» свет і сон. У «рэальным» свеце падаецца, што лірычны герой усё для сябе вырашыў, яму не патрэбны гэтыя зносіны, але толькі наступае ноч – ён сніць шчасце са сваёй каханай. Розум і пачуцці змагаюцца ўнутры яго, свядомыя думкі змяняюцца несвядомымі, і перамога ў выніку дастаецца цвярозасці дня: лірычны герой, не чытаючы, паліць пісьмо. Разам з пісьмом у агні згарае і сам герой, ад яго застаецца толькі попел. Згадка пра пісьмо ў пачатку і фінале верша стварае кальцавую кампазіцыю, надаючы цэласнасць і завершанасць думцы. Пісьмо ў вершы становіцца сімвалам моцных пачуццяў.

Пры дапамозе традыцыйнага вершаванага памера, чатырохстопнага ямба, аўтар лаканічна акрэслівае спектр эмоцый, дамінантныя сярод якіх – горыч і боль. Трапная метафара («я гару і папялею»), яскравыя эпітэты-адсылкі да біблейскай гісторыі («страчаны рай», «спакуслівае дрэва») надаюць твору сэнсавую аб’ёмнасць і глыбіню. Верш насычаны інверсіямі («не вярнуцца з пекла зноў», «хто ў садзе пасадзіў»), якія акцэнтуюць увагу на самым галоўным, надаюць радку напеўнасць, асаблівую рытмамелодыку.

Калі ў дачыненні да верша «Я атрымаў тваё пісьмо…» мы вялі размову пра «страчаны рай», то ў адносінах да твора «Амаль ніколі ў юнацтве…» (1989) будзем гаварыць пра рай «вернуты». У апошнім творы выяўляецца зусім іншы настрой. Лірычны герой успамінае ранейшыя часы і параўноўвае іх з тым, што ёсць зараз:

*Амаль ніколі ў юнацтве*
*Мы не былі з табой*
*Толькі ўдваіх*
*На цэлым свеце.*
*І таму часта зайздросцілі*
*Адаму і Еве* [1, с. 160].

Тут зноў жа сустаракаем алюзію на біблейскі тэкст, а таксама матыў адзіноты: «А зараз, / Калі прыйшло адзіноцтва, / Не ведаем, / Як ад яго ўратавацца» [1, с. 160].

Сябе з каханай лірычны герой зноў суадносіць з адзінымі людзьмі ва ўсім свеце (такой моцы яго каханне), але думка рухаецца ўжо ў іншым кірунку. Яны ёсць адзін у аднаго, але ці дастаткова толькі гэтага? Ведаючы, што Максім Танк пісаў гэты твор у сталым узросце, можна меркаваць пра тое, чым абумоўлена спустошанасць душы лірычнага героя. Верагодна, гэта ад'езд дарослых дзяцей з сям'і. Такім чынам, у творы падымаецца пытанне адзіноцтва ў розныя перыяды жыцця чалавека: маладыя яго чакаюць, мараць, каб ніхто не адцягваў увагу ад іх кахання – людзі ва ўзросце баяцца застацца сам-насам.

*Давай яшчэ раз напомнім*
*Вячэрняму сонцу,*
*Каб не забылася яно*
*Хоць заўтра*
*Нас наведаць* [1, с. 160].

Вобраз сонца паўстае ў вершы як сімвал цыклічнасці жыцця. Сонца ўзыходзіць для моладзі і заходзіць для сталых. Лірычны герой спадзяецца, што яно яшчэ сагрэе яго з каханай, дасць адчуць сябе поўным моцы, як тады, калі каханне толькі зараджалася. Сонца надзяляецца адушаўлёнасцю, яно быццам бы мае ўладу выбіраць, наведваць сягоння каханых ці не. Тут можна весці размову і пра тое, што ва ўзросце кожны дзень можа атрымацца апошнім, як бы горка гэта ні гучала. Сталаму чалавеку застаецца верыць, што сонца прыйдзе не толькі яго, але «нас наведаць», бо, напэўна, жыцця без каханай ён не ўяўляе.

Максім Танк часта звяртаўся да такога віду верша, як верлібр, дасягнуў у абыходжанні з ім вялікага майстэрства. Верш «Амаль ніколі ў юнацтве…» таксама напісаны верлібрам: у ім вытрымліваецца пэўны рытм і заключаецца філасофскі падтэкст. На першы погляд, прысвечаны тэме кахання, твор выклікае роздумы пра жыццё і смерць, хуткаплыннасць жыцця, адзіноцтва нават удваіх…

Абодва творы Максіма Танка – вельмі асабістыя. Яны даюць магчымасць атрымліваць не толькі эстэтычную асалоду, але і здзіўляцца, як эмацыйна насычана і кранальна паэт дзяліўся сваім пачуццём. Каханне паўстае адначасова згубным і суцяшальным: у першым вершы лірычны герой згарае ад яго, у другім – набіраецца моцы і адраджаецца, як фенікс. Творы раскрываюць яшчэ

адну іпастась шматграннай творчай асобы Максіма Танка – майстра інтымнай лірыкі.


**Бібліяграфічны спіс:**

1. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.


## РЭЦЭПЦЫЯ ТЭМЫ ЎКРАДЗЕНАГА ВАЙНОЙ ДЗЯЦІНСТВА Ў КНІЗЕ «НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕМ»


***В. С. Бондарава***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Д. Я. Дрозд*



**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца кніга «Ніколі не забудзем», закранаюцца пытанні ўкрадзенага дзяцінства і выхавання патрыятызму маладога пакалення на прыкладзе дакументальнай кнігі.



**Ключавыя словы:** «Ніколі не забудзем»; Вялікая Айчынная вайна; патрыятызм, дзеці вайны; дзеці-партызаны.


Аповеды беларускіх дзяцей пра суровыя выпрабаванні, прынесеныя агрэсіяй Германіі ў часы Вялікай Айчыннай вайны, з’яўляюцца дакументальнымі звесткамі, запісанымі па ўспамінах юных удзельнікаў партызанскага руху. У кароценькіх апавяданнях, часам вельмі жахлівых і трапных, дзеці, у якіх сапраўды скралі самы шчаслівы час, распавядаюць пра цяжкія і суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны: «Немец не стаў больш распытваць і знік. Пасля яго ў хату ўбег другі, у руках ён трымаў выстаўлены наперад аўтамат. Цётка Агапа стаяла каля печы, а мама сядзела на лаве, каля акна, і на руках трымала меншага браціка Пецю, якому пайшоў толькі чацвёрты год. Нічога не кажучы, немец выстраліў у цётку. Куля трапіла ёй у жывот. Цётка схапілася рукой за рану, павалілася на падлогу і крыкнула:

– Гад нямецкі! Страляй яшчэ, каб не мучыцца!..

Немец выстраліў другі раз» [1, с. 41–42].

Хлопчыкам і дзяўчынкам давялося пасталець вельмі рана, яны згадваюць перажытыя страх і боль, мужнасць і надзею на выратаванне ад пакут: «Мы ўцяклі ў лес. Нас было ўсіх дзесяць: бацькі, сястрычак сем і брат – адзін, Міша. Маіх